www.Belarus-Live.eu

BELARUS Live

NEWSLETTER
25/01-31/01/08

**ПАЛІТЫКА**
▪Вызначаная дата парлямэнцкіх выбараў
▪Чавэс прыедзе ў Беларусь

**АФІЦЫЙНА**
▪Колькасьць назіральнікаў на парлямэнцкіх выбарах абмяжоўвацца ня будзе

**АПАЗЫЦЫЯ**
▪Мінюст часова перадумаў ліквідаваць ПКБ

**ЭКАНОМІКА**
▪Рэзыдэнтам СЭЗ гарантаваны адмысловы прававы рэжым
▪Беларусь страціла мільёны даляраў

**ГРАМАДЗТВА**
▪У Беларусі будзе створаны Інстытут нацыянальнай памяці
▪Толькі чвэрць цяжарнасьцяў праходзіць у Беларусі без праблемаў

**КУЛЬТУРА**
▪Міністэрства інфармацыі Беларусі аднаўляе выданьне адзінага ў краіне беларускамоўнага календара "Родны край"

28 студзеня пасьля сустрэчы прэзыдэнта Аляксандра Лукашэнкі з кіраўніцай Цэнтарвыбаркаму Лідзіяй Ярмошынай фактычна вызначыліся тэрміны чарговай парлямэнцкай кампаніі (хаця адпаведны прэзыдэнцкі ўказ яшчэ не падпісаны). Са слоў Ярмошынай, найхутчэй што выбары ў Палату прадстаўнікоў будуць прызначаны на 28 верасьня 2008 году. Раней кіраўніца Цэнтарвыбаркаму называла аптымальнай датай 12 кастрычніка.

На думку аналітыкаў, улады вырашылі ссунуць кампанію на лета ды самы пачатак восені, каб максымальна абмежаваць магчымасьці апазыцыі. Лета – наагул мёртвы сэзон для палітыкі, у верасьні ж беларусы жывуць клопатамі пра ўраджай. Таму традыцыйная агітацыя ўладаў за датэрміновае галасаваньне будзе выглядаць натуральным клопатам пра інтарэсы паспалітага люду: маўляў, аддаўшы голас загадзя, можна са спакойнай душой выпраўляцца ў выходны на свой зямельны ўчастак.

Беларускі Выбарчы кодэкс прадугледжвае аж пяць дзён датэрміновага галасаваньня, прычым доля грамадзянаў, якія выкарыстоўваюць такую магчымасьць, апошнімі гадамі значна ўзрасла. Так, на прэзыдэнцкіх выбарах 2006 году датэрмінова прагаласавалі 31,3% тых, хто ўдзельнічаў у выбарах.

Крытыкі ўлады сьцьвярджаюць, што яна выкарыстоўвае прымус, каб людзі галасавалі датэрмінова. Асабліва актыўна выкарыстоўваюцца адміністрацыйныя мэтады ў дачыненьні да тых катэгорыяў электарату, што вельмі залежныя ад непасрэднага начальства (студэнты, вайскоўцы, працаўнікі дзяржаўных прадпрыемстваў ды інш.). Як сьцьвярджае апазыцыя, непразрыстая працэдура датэрміновага галасаваньня стварае асабліва спрыяльныя ўмовы для падтасоўкі вынікаў (цяжка пракантраляваць, напрыклад, ці не падмяняюцца ўначы ўкінутыя ў скрыні бюлетэні).

Пры гэтым прэзыдэнт Беларусі 28 студзеня заявіў аб намеры забясьпечыць дэмакратычны характар кампаніі і не абмяжоўваць колькасьць замежных назіральнікаў. На думку незалежных экспэртаў, такія заявы тлумачацца тым, што ў краіне створаны лятэнтны, схаваны ад вачэй назіральнікаў мэханізм афармленьня патрэбных уладзе электаральных вынікаў.

Пры гэтым беларускія палітолягі схіляюцца да думкі, што стратэгія ўладаў будзе палягаць у максымальнай дэпалітызацыі парлямэнцкіх выбараў, бо палітычныя дыскусіі нясуць пагрозу дэстабілізацыі абстаноўкі, асабліва ў зьвязку з узмацненьнем эканамічных праблемаў ды згортваньнем сацыяльных гарантыяў (у прыватнасьці, скасаваньнем бальшыні льготаў для насельніцтва ў сьнежні 2007 году).

На думку аналітыкаў, варыянт правядзеньня чарговых выбараў з выкарыстаньнем элемэнтаў прапарцыйнай сыстэмы становіцца ўсё меней імаверным. А фарсаванае стварэньне прапрэзыдэнцкага грамадзкага аб'яднаньня "Белая Русь", у якім многія ўбачылі прататып партыі ўлады, найхутчэй што ёсьць паліттэхналягічнай загатоўкай на пэрспэктыву.

"Рэжым не зьбіраецца займацца палітычнай трансфармацыяй, лібэралізаваць выбарчае заканадаўства", — лічыць, у прыватнасьці, палітоляг Віктар Чарноў. Зь ягоных словаў, на сёньня няма ні ўнутраных, ні вонкавых чыньнікаў ціску, якія б змусілі Менск мяняць Выбарчы кодэкс ды жорсткую ў дачыненьні да апанэнтаў практыку правядзеньня электаральных кампаніяў.

Разам з тым незалежныя аналітыкі кажуць, што байкот выбараў, які прапануецца асобнымі апазыцыйнымі палітыкамі, будзе неэфэктыўным, бо ня выкліча шырокага грамадзкага рэзанансу. Задача апазыцыі, мяркуюць аналітыкі, палягае ў тым, каб накінуць свой контарсцэнар кампаніі, правесьці яе крэатыўна і наступальна, акцэнтуючы ўвагу на правалах кіроўнай палітыкі і нязручных для ўлады пытаньнях (сацыяльная абарона, інфляцыя, будаўніцтва АЭС і г.д.).

Між тым на сёньня ступень падрыхтаванасьці палітычнай апазыцыі да выбараў слабая. Так і ня складзены адзіны сьпіс кандыдатаў ад Аб'яднаных дэмакратычных сілаў, які абяцалі падрыхтаваць яшчэ да Новага году. Як прызнаўся днямі старшыня Аб'яднанай грамадзянскай партыі Анатоль Лябедзька, адпаведная праца тарпэдуецца раскольніцкімі дзеяньнямі асобных апазыцыйных лідэраў. На думку ж аналітыкаў, горш за ўсё тое, што ў апазыцыі не праглядаецца моцнай ідэалёгіі кампаніі, бачаньня яе як нейкага зьвяна ў паліттэхналягічным ланцугу, этапу мацаваньня шэрагаў ды падрыхтоўкі да прэзыдэнцкіх выбараў 2011 году.

Тым часам 29–30 студзеня Менск наведаў міністар замежных спраў Расеі Сяргей Лаўроў. Падчас сустрэчы зь ім беларускі прэзыдэнт Аляксандар Лукашэнка заявіў, што яго краіна гатовая да прынцыповай каардынацыі сваёй замежнай палітыкі з Масквой. Лаўроў, са свайго боку, выказаў заклапочанасьць ціскам з боку Захаду на Беларусь і даў зразумець, што Крэмль гатовы па-ранейшаму абараняць саюзьніка на міжнароднай арэне.

Аналітыкі адзначаюць, што апошнім часам стасункі між Менскам і Масквою пацяплелі. У прыватнасьці, Расея дала крэдыт на 1,5 млрд. даляраў на выгадных умовах і паабяцала яшчэ адзін — на 2 млрд. даляраў, пастаўляе газ па 119 даляраў за тысячу кубамэтраў — таньней, чым любой іншай краіне Эўропы, уключна з дзяржавамі СНД.

На думку экспэртаў, такая шчодрасьць можа тлумачыцца нейкімі патаемнымі дамоўленасьцямі, дасягнутымі на сьнежаньскай сустрэчы прэзыдэнтаў Расеі і Беларусі. Апазыцыя выказвае засьцярогу, што гэта можа несьці небясьпеку беларускай незалежнасьці цераз экспансію расейскага капіталу ды падпісаньне Канстытуцыйнага акту Саюзнай дзяржавы з далейшай інкарпарацыяй Беларусі.

---

# ПАЛІТЫКА

## Вызначаная дата парлямэнцкіх выбараў

**Парлямэнцкія выбары ў Беларусі пройдуць 28 верасьня 2008 году.**

Першапачаткова плянавалася, што выбары адбудуцца 12 кастрычніка. Аднак гэтая дата супадала з выбарамі ў Савет Рэспублікі.

Старшыня Цэнтральнай выбарчай камісіі Лідзія Ярмошына паведаміла, што ў сувязі з вызначэньнем даты распрацаваны праект каляндарных мерапрыемстваў, а таксама шэраг дакумэнтаў. У бліжэйшым часе ў Міністэрства замежных спраў будзе накіраваны законапраект, які рэгулюе правілы галасаваньня беларускіх грамадзянаў за мяжой.

## Чавэс прыедзе ў Беларусь

**Магчыма, што прэзыдэнт Вэнэсуэлы Уга Чавэс увесну прыедзе зь візытам у Беларусь.**

Паводле Часовага Паверанага ў справах Баліварыянскай Рэспублікі Вэнэсуэла ў Беларусі Амэрыка Дыяса Нуньеса, плянуемы тэрмін візыту — сакавік.

Паводле словаў дыплямата, намер наведаць Беларусь пацьвярджае вялікую цікавасьць вышэйшага кіраўніцтва Вэнэсуэлы да двухбаковага супрацоўніцва. Уга Чавэс двойчы прыяжджаў у Беларусь — у ліпені 2006 году і ў чэрвені 2007 году.

# АФІЦЫЙНА

## Колькасьць назіральнікаў на парлямэнцкіх выбарах абмяжоўвацца ня будзе

**Старшыня Цэнтарвыбаркаму Лідзія Ярмошына абмеркавала з прэзыдэнтам пытаньні, зьвязаныя з будучай выбарчай кампаніяй.**

Выбары ў парлямэнт краіны павінны адбыцца напрыканцы верасьня, а афіцыйная выбарчая кампанія распачнецца ў чэрвені. Падчас сустрэчы Аляксандар Лукашэнка заявіў, што на выбары будуць запрошаныя замежныя назіральнікі, а іх колькасьць, як з боку АБСЭ, так і СНД, не павінна абмяжоўвацца. Адначасова было падкрэсьлена, што прадстаўнікі палітычных партый змогуць вылучаць сваіх прадстаўнікоў у склад Цэнтральнай выбарчай камісіі, а таксама абмяркоўваць праблемы, зьвязаныя з арганізацыяй выбарчай кампаніі.

# АПАЗЫЦЫЯ

## Мінюст часова перадумаў ліквідаваць ПКБ

**Міністэрства юстыцыі Беларусі накіравала просьбу ў Вярхоўны суд прыпыніць разгляд зыску аб ліквідацыі апазыцыйнай Партыі камуністаў Беларускай. Мінюсту патрэбны час для вывучэньня дакумэнтаў, якія яно атрымала ад партыі.**

Мінюсту патрэбны час для вывучэньня дакумэнтаў, якія яно атрымала ад партыі. У гэтых дакумэнтах ПКБ інфармуе пра ліквідацыю ўсіх парушэньняў, па прычыне якіх дзейнасьць партыі была прыпыненая й была распачатая справа па яе ліквідацыі.

Нагадаем, што з 2 жніўня мінулага году да 2 лютага дзейнасьць партыі прыпыненая. Лідэр ПКБ Сяргей Калякін паведаміў, што адразу пасьля 2 лютага партыя працягне сваю дзейнасьць і адразу правядзе паседжаньне Цэнтральнай камісіі. Сяргей Калякін лічыць, што рашэньне Мінюсту лягічнае, аднак падкрэсьлівае, што гэта не азначае канца праблемаў партыі.

# ЭКАНОМІКА

## Рэзыдэнтам СЭЗ гарантаваны адмысловы прававы рэжым

**Для рэзыдэнтаў беларускіх спэцыяльных эканамічных зонаў ствараюцца дадатковыя льготы пры рэалізацыі інвэстыцыйных праектаў.**

Прэзыдэнт краіны Аляксандар Лукашэнка падпісаў указ, які ўносіць дапаўненьні й зьмены ў некаторыя ўказы па пытаньнях дзейнасьці СЭЗ. Пра гэта паведамляе БелТА са спасылкай на прэс-службу кіраўніка дзяржавы.

У прыватнасьці, рэзыдэнтам зоны гарантаваны цягам 7 гадоў адмысловы рэжым падаткаабкладаньня, а таксама прадастаўленыя льготныя ўмовы арэнднай платы за зямельныя ўчасткі пад рэалізацыю інвэстыцыйных праектаў. Дадаткова рэзыдэнты СЭЗ вызваляюцца ад уплаты падатку на нерухомасьць і падатку на набыцьцё аўтамабільных транспартных сродкаў. Акрамя гэтага, дзяржава будзе садзейнічаць у фінансаваньні будаўніцтва й разьвіцьця аб'ектаў інфраструктуры.

Указ набудзе моц 1 красавіка 2008 году.

## Беларусь страціла мільёны даляраў

**Страты Беларусі ў сувязі з пратэстам польскіх мытнікаў і сытуацыяй на польска-беларускай мяжы сягаюць дзясяткаў мільёнаў даляраў, інфармуе агенцтва "Інтэрфакс".**

Начальнік упраўленьня зьнешнеэканамічнай дзейнасьці Міністэрства транспарту Сяргей Нягрэй падкрэсьлівае, што ля мяжы на польскім баку знаходзяцца прынамсі тры тысячы аўтамабіляў. Суткі прастою аднаго грузавіка каштуюць фірме-перавозчыку 300 даляраў.

„Страты ў эканоміцы Беларусі — гэта страчаны прыбытак ад транзыту, страты ў гандлі ды сфэры абслугоўваньня. Агулам для цэлай краіны гэтая сума значна большая", — падкрэсьлівае Сяргей Нягрэй.

Паводле Беларускай асацыяцыі міжнародных аўтаперавозчыкаў, у Берасьцейскай і Гарадзенскай абласьцях крызыс на мяжы адмоўна ўплывае на дзейнасьць і прыбытак 300 фірмаў.

# ГРАМАДЗТВА

## У Беларусі будзе створаны Інстытут нацыянальнай памяці

**У Менску створаны аргкамітэт па стварэньні грамадзкага аб'яднаньня "Інстытут нацыянальнай памяці".**

У склад камітэту ўвайшлі прадстаўнікі беларускай інтэлігенцыі, у тым ліку народны паэт Беларусі Рыгор Барадулін, акадэмік Радзім Гарэцкі, гісторык Ігар Кузьняцоў, акадэмік Генадзь Лыч ды іншыя. Пра гэта паведамляе партал "Беларускія навіны".

Асноўныя мэты інстытуту — гэта складаньне пераліку стратаў, нанесеных беларускаму народу, яго генафонду, культуры ды мове акупацыйнымі рэжымамі. Арганізацыя будзе займацца ўшанаваньнем памяці пра зьніклыя вёскі, а таксама публікацыяй выданьняў аб выдатных ураджэнцах беларускай зямлі, якія зрабілі ўнёсак у разьвіцьцё навукі й культуры народаў сьвету.

## Толькі чвэрць цяжарнасьцяў праходзіць у Беларусі без праблемаў

**За мінулы год на сьвет зьявілася 103 425 беларусаў.**

Толькі кожная чацьвертая цяжарнасьць, а дакладней 26%, праходзіць у Беларусі без праблемаў — паведамляюць у Міністэрстве аховы здароўя. Галоўная прычына, што ня ўсё адбываецца добра, лічаць мэдыкі, — гэта недастатковая ўвага жанчын да ўласнага здароўя ў часе цяжарнасьці. Лекары зьвяртаюць увагу, што культура цяжарнасьці ў нас застаецца нізкая — жанчына часта папросту ня ведае, што можна, што нельга, як сябе паводзіць. У выніку адбываюцца такія ўскладненьні, як парокі разьвіцьця дзіцяці, унутрыўтробнае інфэкцыяваньне, нараджэньне неданошаных дзетак.

За 2007 год у Беларусі ў часе нараджэньня дзіцяці памерлі 6 жанчын, за 2006 год — адзінаццаць. Як кажуць мэдыкі, гэты паказчык у Беларусі — самы нізкі з краінаў

СНД. Сьмяротнасьць сярод немаўлятаў у Беларусі склала 5,2 дзетак на 1000 народжаных. Год раней паказчык быў роўны 6,2.

## КУЛЬТУРА

### Міністэрства інфармацыі Беларусі аднаўляе выданьне адзінага ў краіне беларускамоўнага календара "Родны край"

**Пра гэта паведамляе агенцтва БелаПАН. У лісьце, які атрымала Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны ад віцэ-міністра Ігара Лапцёнка, гаворыцца, што выданьне календара на 2009 год было ўключана ў сьпіс сацыяльна важнай літаратуры.**

Яго выданьнем зоймецца выдавецтва "Беларусь".

У лістападзе мінулага году ТБМ паведаміла, што Міністэрства інфармацыі мае намер адмовіцца ад выданьня календара "Родны край". У сувязі з гэтым кіраўніцтва арганізацыі зьвярнулася да чыноўнікаў з просьбай патлумачыць сытуацыю.

Нагадаем, што адзіны беларускамоўны каляндар "Родны край", які выдаваўся з 1990 году, сёлета ня быў выдадзены.

---

Існуе шмат сайтаў, прысьвечаных падзеям у Беларусі, аднак яны малавядомыя ў Заходняй Эўропе, асабліва тым, хто займаецца фармаваньнем палітыкі адносна Беларусі й ня ведае беларускай ды расейскай моваў.

Сэрвіс belarus-live запаўняе гэты прагал. Штотыднёвую рассылку на ангельскай, польскай, беларускай ды расейскай мовах можна замовіць на сайце.